***А.А. Мінюк, К.Д. Цярлюкевіч***
БГЭУ (Минск)

СЫМОН БУДНЫ – АСВЕТНІК І ГУМАНІСТ

Прадаўжальнікам справы Францыска Скарыны ў Беларусі, толькі ўжо ў новых сацыяльна-культурных умовах, у перыяд Позняга Адраджэння, выступіў Сымон Будны. Характар яго дзейнасці абумоўлены Люблінскай уніяй 1569 года і пашырэннем Рэфармацыі.

Сымон Будны – дзеяч беларускай культуры, гуманіст, філосаф, асветнік. Актыўны ўдзельнік рэфармацыйнага руху, адзін з заснавальнікаў навуковай крытыкі Бібліі. Разам з Л.Крышкоўскім, М.Кавячынскім і яго братамі заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе ў 1562 г. выдаў на беларускай мове кнігі "Катэхізіс" і "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам".

Палітычныя і прававыя погляды Сымона Буднага былі выкладзены ім перш за ўсё, у творы “Аб свецкай уладзе”. Мысліцель уступае ў дыскусію з левымі радыкаламі, якія адстойвалі ідэю скасавання дзяржавы. Сымон Будны абгрунтаваў неабходнасць джяржаўнай ўлады. Ён вылучаў наступныя функцыі дзяржаўнай улады: кіраўніцтва грамадскім жыццём, абарона грамадзян, ахова спакою і парадку. Адказывючы апанентам на іх абвінавачвання ўлады ва злоўжываннях, ён падкрэсліваў, што калі чыноўнік паступае не па-хрысціянску, нельга вінаваціць уладу, а трэба вызваляць тых яе носьбітаў, якія сеюць зло.

Сацыялна-палітычныя погляды Сымона Буднага былі памяркоўна-гуманістычныя. Асаблівасцю іх былі пазітыўныя адносіны да існуючых грамадскіх і дзяржаўных інстытутаў, рэформы меркавалася ім толькі ў межах наяўнага соцыуму, змяненню падлягала не сістэма ў цэлым, а некаторые яе элементы. Будны прызнаваў прыватную ўласнасць, разам з тым прапаноўваў радыкальную рэформу ўсёй сістэмы царкоўнага землеўладання: зямля павінна належаць не манастырам, але царкоўным абшчынам, а даходы ад яе ісці на школьную адукацыю, утрыманне настаўнікаў, бедных вучняў, прапаведнікаў, будаўніцтва бальніц і дамоў для старых. Будны быў прыхільнікам сацыяльнай гармоніі, мірнага суіснавання ўсіх саслоўяў феадальнага грамадства. Кожны,

лічыў ён, павінен займаць пэўнае, адведзенае яму гістарычнымі абставінамі месца ў грамадстве. Дзяржаўная ўлада з'яўляецца боскім устанаўленнем, і ёй неабходна падпарадкоўвацца.

Асабліва шырокі розгалас у свеце атрымаў яго пераклад Новага Запавету 1574 года. І гэта не выпадкова: ніхто з тагачасных еўрапейскіх перакладнікаў новазапаветных твораў не рабіў дагэтуль такой велізарнай тэксталагічнай працы, як Будны. Дзякуючы фенаменальным аналітычным здольнасцям беларускага асветніка, ягонаму таленту, шырокай эрудыцыі, дасканаламу веданню старажытных моваў навукова-крытычны ровень выдання Новага Запавету 1574 года стаўся, бадай, самым высокім сярод усіх вядомых на той час у Еўропе.

Ідэі Сымона Буднага паўплывалі на развіццё еўрапейскага рацыяналізму XVII ст., садзейнічалі фарміраванню вальнадумства. Як прадаўжальнік традыцый Ф. Скарыны, ён выступаў за роўнасць саслоўяў перад законам і справядлівасць правасуддзя. Яго палітычны ідэал – асветная манархія. Не адмаўляючы сутнасці прыгонніцтва, патрабаваў абмежавання феадальнага самавольства. Лічыў, што простаму народу патрэбны мір, што феадалы павінны клапаціцца пра яго адукацыю. Сымон Будны шмат зрабіў для развіцця беларускай мовы, выступаў за выкарыстанне жывой народнай мовы ў рэлігійным пісьменстве і царкоўных набажэнствах, за ўсебаковае супрацоўніцтва славянскіх народаў.

Такім чынам, мы бачым, што Сымон Будны ўнес свой уклад у развіццё дактрыны ідэальнай дзяржавы.